суверенитете Абхазской ССР» и постановление «О правовых гарантиях защиты государственности Абхазии» [3].

В соответствии с Законом СССР «О порядке решения вопросов, связанных с выходом союзной республики из состава СССР» от 3 апреля 1990 г. автономные республики, в случае выхода союзной республики из СССР, обладали правом самостоятельно решать вопрос о пребывании в составе СССР и о своем государственно-правовом статусе. Абхазия воспользовалась своим правом и 17 марта 1991 г. приняла участие во всесоюзном Референдуме по вопросу сохранения СССР, на котором 98,6 % населения проголосовало «за».

Таким образом, неизбежным становится вывод, что к моменту распада СССР государственно–правовые отношения между Грузией и Абхазией были прекращены. Абхазия осталась в составе СССР, а Грузия вышла из него. Вследствие этого на территории СССР образовались два не связанных друг с другом государства – Грузия, провозгласившая свою независимость и Абхазская ССР, остававшаяся субъектом СССР вплоть до его распада 21 декабря 1991 г. С распадом СССР Республика Абхазия стала независимым государством[1]. Опираясь на правовое основание суверенитета Абхазии, Верховный Совет республики отменил Конституцию 1978 г. и восстановил Конституцию 1925 г., в соответствии с которой Абхазия являлась суверенной республикой.

**Литература**

1 Бгажба, О. Х. История Абхазии с древнейших времен до наших дней [Электронный ресурс] / О. Х. Бгажба, С. З. Лакоба; Режим доступа: www.apsuara.ru.– Дата доступа: 17.09.2011.

2 Грузино-абхазский конфликт: краткая история. Справка. Режим доступа: http://ria.ru/spravka/20080701/112698696.html. – Дата доступа: 17.11.2013.

3 Лакоба, С. Абхазия – де-факто или Грузия де-юре? (О политике России в Абхазии в постсоветский период. 1991–2000 гг.) / С. Лакоба; АбИГИ.– Сухум, 2002. – 172 с.

**УДК 398.3:398.91(476.2)**

***Т. У. Каранькова***

## МІФАЛАГІЧНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ АБ ПРЫРОДНЫХ СТЫХІЯХ НА МАТЭРЫЯЛЕ ПРЫКАЗАК І ПРЫМАВАК ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

*У артыкуле, які прысвечаны даследаванню міфалагічных уяўленняў, звязаных з прыроднымі стыхіямі, прааналізаваны вераванні пра зямлю, ваду, агонь, а таксама семантыка міфалагем сонца і месяца. На аснове значнай колькасці прыкладаў прыказак і прымавак, запісаных на тэрыторыі Гомельшчыны і апублікаваных у акадэмічным выданні серыі БНТ, разглядаюцца адлюстраваныя ў іх павер'і, праведзеныя сістэматызацыя фактычнага матэрыялу і яго тэарэтычнае асэнсаванне дазволілі раскрыць асаблівасці ўспрымання беларусамі навакольнага свету, падкрэсліць паэтычнасць іх светапогляду, выявіць адметнасці прыродных вераванняў нашых продкаў.*

Прыказкі і прымаўкі выкарыстоўваюцца чалавекам з глыбокай старажытнасці. Сфера адлюстравання з'яў навакольнага свету ў іх звязана, найперш, з жыццём чалавека ў розныя гістарычныя перыяды і эпохі.

Найбольш старажытныя прыказкі і прымаўкі прысвечаны прыродзе, расліннаму і жывёльнаму свету. Перш за ўсё, селянін з вялікай пашанай ставіўся да зямлі, своеасабліва абагаўляў яе. Уяўленне пра міфалагему Зямлі істотна дапаўняецца яе своеасаблівымі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«партрэтнымі» рысамі, якія вызначае А. М. Афанасьеў: «На старажытнай паэтычнай мове травы, кветкі, кустарнікі і дрэвы называліся валасамі зямлі. Прызнаючы зямлю за істоту жывую, якая дзейнічае самастойна (яна нараджае са свайго мацярынскага ўлоння, п'е дажджавую ваду, сутаргава дрыжыць пры землятрусах, засынае зімою і абуджаецца са зваротам вясны), першабытныя плямёны параўноўвалі шырокія прасторы сушы з волатаўскім целам. У цвёрдых скалах і каменнях бачылі яе косці, у вадзе – кроў, у драўляных каранях – жылы і, нарэшце, у травах і раслінах – валасы» [3, с. 57–58].

Характэрна шматграннасць і разнастайнасць асэнсавання вобраза зямлі ў народнай свядомасці. У некаторых варыянтах прыказак і прымавак зямля разглядаецца як касмічны аб'ект, які супастаўляецца з сонцам, месяцам, зоркамі: «Да першага грому зямля не адтае» [1, с. 52], «Пакуль гром не загрыміць, зямля не адтае» [1, с. 52]. У іншых варыянтах яна разумеецца як аснова жыцця прыроды і разам з сонцам выступае галоўным суб'ектам гадавога цыкла, змены пораў года: «І зямля кажа» [1, с. 51], «На добрай зямлі добра надзея» [1, с. 51]. Сустракаюцца такія варыянты прыказак і прымавак, у якіх зямля – гэта аснова жыцця чалавека ў прыродзе, на ніве, якая яго корміць, адсюль і самы распаўсюджаны вобраз зямлі ў народнай свядомасці – маці–карміцелька: «На добрай зямлі дзіцяя пасадзі, і тое вырасце» [1, с. 51], «Зямля – нас усіх маці: яна нас корміць, яна нас прыгорне» [1, с. 51], «Зямелька нас корміць, а сама есці просіць» [1, с. 51].

Засяродзім увагу на прыкладах прыказак і прымавак, якія адлюстроўваюць народныя ўяўленні пра ўрадлівасць зямлі: «Зямелька – матка наша: і корміць, і поіць, і адзяваець нас» [1, с. 51]; «Зямля багацей за ўсіх» [1, с. 51]; «На добрай зямлі добра надзея» [1, с. 51]; «Такая зямля добрая: пасадзі аглоблю – калёсы вырастуць» [1, с. 51]; «На добрай зямлі дзіцяя пасадзі, і тое вырасце» [1, с. 51]. Імкнучыся дзейнічаць, прытрымліваючыся логікі ўспрымання навакольнага свету як жывога, земляроб не можа не адносіцца з пашанай да стыхій і з'яў прыроды. Вялікай ісцінай, якая была важнай у светапоглядзе земляроба, з'ўлялася тая, што зямлю нельга перахітрыць. Таму, хто спрабуе гэта зрабіць, зямля адказвае неўраджаем: «Пакуль гром не загрыміць, зямля не адтае» [1, с. 52], «Да першага грому зямля не ачышчаецца» [1, с. 52].

У паэтызаваных уяўленнях славян–земляробаў зямля – агульная маці, апякунка і галоўная заступніца ўсіх людзей. У зямлі пытаюцца парады, да яе ідуць каяцца ў грахах, і яна ўсіх выслухае і за ўсіх моліцца: «І зямля кажа» [1, с. 52], «Зямля святая ўсё прымае» [1, с. 52], «Зямля не згарыць, не ўтоне» [1, с. 51], «На белай зямлі сабакі касцяць, на чорнай пшанічку расцяць» [1, с. 52].

У прыказках і прымаўках знайшлі ўвасабленне міфалагічныя ўяўленні амбівалентнага характару, звязаныя і з такімі прыроднымі стыхіямі, як вада і агонь: «Вады бойся як агню» [1, с. 58], «Вада і агонь – усяму сіла» [1, с. 59], «Не гуляй з агнём» [1, с. 59], «З агнём жартаў няма» [1, 59], «Хто іграе з агнём, дайграецца да попелу» [1, с. 59], «Хто агонь хапае, той пальцы абсмале» [1, с. 60], «Агонь з вадою не дружыць» [1, с. 58], «Вада агню не таварыш» [1, с. 59], «З агнём не жартуй і вадзе не вер» [1, с. 59], «Агонь начыста прыбярэ» [1, с. 59], «Ад іскры і вада можа загарэцца» [1, с. 60]. Вада заўсёды ўяўляла сабой вялікую загадку для чалавечага розуму, асабліва гэта датычыць яе ўласцівасцяў.Назіраючы за імклівымі струменьчыкамі вады, чалавек можа здымаць сваё нервовае і псіхічнае напружанне.

Вада можа прыносіць не толькі карысць, але можа і шкодзіць чалавеку, аб чым сведчаць наступныя тэксты прыказак і прымавак: «Вада і мельніцу ламае» [1, с. 57], «Вада камень прабівае» [1, с. 57], «Дзе вада, там і бяда» [1, с. 58], «Вада млыны і грэблю рве», [1, с. 57], «Прыткая вада берагі падрываець» [1, с. 57], «Ціхія воды глыбокі» [1, с. 57], «Што ў ваду ўпала, то пішы прапала» [1, с. 57], «Не мора топіць – лужа» [1, с. 58], «Проці ветру не дыхнеш, проці вады не папрэшся» [1, с. 58], «Паводкі і цар не ўйме» [1, с. 58].

У прыказках і прымаўках шырока адлюстравана міфалагема сонца: «Слонца грэе – душа млее» [1, с. 52], «Колас добра не спее, калі сонца не грэе» [1, с. 52], «Сонца праўдзіва, усім праўдзіва дзелаець» [1, с. 52], «Усякаму чалавеку слонка свеціць» [1,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

с. 52], «Сонца па небу ходзіць і не ўсім угодзіць» [1, с. 53]. Гэта нябеснае свяціла, якое славяне шанавалі як крыніцу жыцця, цяпла і святла. На народныя ўяўленні пра Сонца і навакольны свет аказалі ўплыў царкоўна–кніжныя традыцыі. Станаўленне і развіццё ўяўленняў, звязаных з культам сонца, генетычна ўзыходзіць да першабытнай эпохі, часу нараджэння першых архетыпаў у ментальнасці нашых продкаў. На думку даследчыка Тапаркова, «у фальклоры Сонца называлі ясным і чырвоным, божым і праведным, добрым і чыстым. Яно прадстае ў павер'ях як разумная і дасканалая істота, якая ці сама з'яўляецца боствам, ці выконвае боскую волю. У народных уяўленнях Сонца – гэта твар, вока ці слова Бога, ці ваконца, праз якое Бог глядзіць на зямлю. Факты ўшанавання Сонца абумовілі ўзнікненне шматлікіх правіл і забарон: не станавіся да Сонца спінаю нават у час працы на полі, не спраўляй свае патрэбы так, каб гэта магло бачыць Сонца, не плюй у яго бок, інакш запануе цемра, не паказвай на яго пальцам, бо выкалеш яму вока і інш. Пасля заходу Сонца не давалі нічога з дому ў доўг, асабліва агонь, каб шчасце і дастатак не пакінулі сям'ю, не выкідвалі смецце на вуліцу, не пачыналі есці новы акраец хлеба» [2, с. 362].

Як начное свяціла Месяц супрацьпастаўлены Сонцу як дзённаму свяцілу, што знайшло сваё ўвасабленне ў наступных прыказках і прымаўках: «Чым сонца яснее, тым месяц смутнее» [1, с. 52], «Сонца з–за хмары, а месяц у шпары» [1, с. 52]. Міфалагема Месяца з'яўляецца вельмі распаўсюджанай у сусветным фальклоры, у тым ліку і ў беларускім. Яскравым доказам гэтага з'яўляецца запіс А. Сержпутоўскага: «Месяцу Бог вялеў свяціць людям у ночы, пакуль сонейко апачывае, толькі месяц гультаяваты, ён кепсько свеціць, за тое Бог вялеў, каб ён кожныя чатыры нядзелі перараджаўся. От затым ён адну нядзелю малады, другую расьце аж да поўна, трэйцюю поўны, а чацьвортую саўсім прападае. Месяц мае вялікую ўладу на расліну, жывёлу, людзей і нават на пагоду» [4, с. 6].

Назва Поўня замацавалася за Месяцам у беларускай мове параўнальна нядаўна. Магчыма, назва начнога свяціла жаночага роду дапамагае больш зручна вытлумачыць менавіта жаночы характар гэтага міфалагічнага вобраза. Гэты матыў знайшоў адлюстраванне ў міфалогіі многіх народаў свету. Нашы продкі вельмі многае звязвалі ў сваім жыцці з месяцам. Існавалі розныя прыкметы і павер'і, якія мелі сувязь з Поўняй. Народныя вераванні, звязаныя з месяцам, адрозніваюцца асаблівай паэтычнасцю: «Маладзік малады, рог залаты» [1, с. 53], «Маладзік умываецца, то будзе непагадзь» [1, с. 53], «Маладзік рогі задраў на пагоду» [1, с. 53], «Дармо ў бога хлеб ясі: свеціш, да не грэеш» [1, с. 53]. Семантыка міфалагемы Месяца больш складаная, чым іншых нябесных свяціл. Месяц здольны прыносіць людзям дабро і шкоду, пасылаць хваробу і вылечваць яе, садзейнічаць у пэўныя прыродныя перыяды эфектыўнасці лекавых траў, уплываць на рост раслін, прадказваць лёс чалавека.

У прыказках і прымаўках найбольш ярка адлюстравалася сувязь сонца і месяца з клопатамі земляроба. Значэнне такіх прыказак і прымавак, як «Сонца ўстане, так і дзень настане» [1, с. 52], «Як слонка выгрэе, то аж сэрцу мілее» [1, с. 52], «І да мышкі сонца загляне» [1, с. 52], не вынікае з сумы сэнсаў кампанентаў, што складаюць іх змест. Гэта алегарычныя выразы, якія фарміруюцца на аснове пэўных асацыяцый. Прыказкі, што прадстаўлены ўстойлівымі выразамі, ужываюцца толькі ў прамым значэнні: «Сонца ўстане, так і дзень настане» [1, с. 52], «Сонца нізка – вечар блізка» [1, с. 52], «Як сэрца чалавеку патрэбна, так патрэбна і зямлі сонца» [1, с. 52]. Нашы продкі верылі, што жыццё – гэта вечны кругазварот пераўтварэнняў, яно не можа спыніцца, перарвацца. Сустракаючы кожную раніцу Сонца і вітаючы яго малітвай, старажытны чалавек быў упэўнены ў перамозе света над цемрай, дабра над злом, еднасці сябе з Сусветам.

Тэкст у прыказках і прымаўках набывае пэўную ўстойлівасць, што дае падставы вылучыць стэрэатыпнасць як адметную і вызначальную характарыстыку парэмій. Прыказкі і прымаўкі яскрава ўвасобілі народныя вераванні, звязаныя са з'явамі і стыхіямі прыроды. Гэтыя адметныя малыя формы фальклору з'яўляюцца неацэнным скарбам

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларусаў, які не страціў сваёй актуальнасці і ў наш час, бо ў прыказках і прымаўках адлюстраваны іх павучальны сэнс, а таксама сканцэнтраваны каштоўныя практычныя парады і мудрыя рэкамендацыі нашых продкаў.

**Літаратура**

1 Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. Кн. 1 / склад. М. Я. Грынблат: рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 506 с.

2 Топорков, А. Л. Солнце / А. Л. Топорков // Славянская мифология : энцикл. словарь / науч. ред. В. Я. Петрухин, Т. А. Агапкина [и др.]. – Москва, 1995. – С. 361–363.

3 Афанасьев, А. Н. Древо жизни: избранные статьи / [подготовка текста и коммент. Ю.М. Медведева, вступит, статья Б. П. Кирдана]. – Москва: Современник, 1982. – 464 с.

4 Сержпутоўскі, А. К. Прымхі і забабоны беларусаў–палешукоў / А. К. Сержпутоўскі – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

**УДК 159.923–053.4:316.362–056.83**

***Е. В. Карасева***

## ЛИЧНОСТНЫЕ ОСОБЕННОСТИ ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА ИЗ СЕМЕЙ С АЛКОГОЛЬНОЙ ЗАВИСИМОСТЬЮ

*Статья посвящена личностным особенностям детей старшего дошкольного возраста из семей с алкогольной зависимостью. Рассматриваются нарушения в формировании личностных качеств в условиях физической и эмоциональной отверженности со стороны родителей. Дается анализ социальных факторов, влияющих на формирование подростков.*

Дошкольный возраст это возраст интенсивного усвоения примера взрослых и формирование механизмов личностного поведения, т. е. «механизмов подчинения своего отношения к вещам и другим людям, идеально данным образцом, усвоенным от взрослых» [1, с. 114].Так эмоциональное и личностное благополучие ребенка в семье в немалой степени определяется тем, насколько созданы в ней условия для успешного развития.

У ребенка, испытывающего физическую и эмоциональную отверженность со стороны родителей, нарушается формирование личностных качеств, это чаще происходит в неблагополучных семьях. В результате у этих детей появляется чувства неадекватности, стыда за себя и родителей перед окружающими, страх и боль за свое настоящее и будущее.

Среди неблагополучных семей наиболее распространенными являются те, в которых один или несколько членов зависимы от употребления психоактивных веществ, прежде всего алкоголя и наркотиков.

Обычно взрослые, в такой семье забыв о своих родительских обязанностях, целиком и полностью погружаются в алкогольную субкультуру, что сопровождается потерей общественных и нравственных ценностей и ведет к социальной и духовной деградации. В конечном итоге семьи с алкогольной зависимостью становятся дисфункциональными, что проявляется в виде следующих признаков: члены семьи не уделяют внимание друг другу, в особенности родители детям; родители плохо относятся к детям либо вообще их не замечают; вся жизнь характеризуется непостоянством и непредсказуемостью, а отношение между членами – ригидностью и деспотичностью; члены семьи озабочены отрицанием реальности, им приходиться тщательно скрывать неприятные семейные тайны от окружающих; в правилах семьи значительное место занимают запреты свободно выражать свои потребности и чувства, часто используются

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ